«Адрамантуем бальніцу разам!»

Акцыя пад такой назвай праходзіць на Крычаўшчыне

Яе мэта — збор сродкаў на завяршэнне рамонту старога лячэбнага корпуса цэнтральнай раённай бальніцы, піша раённая газета «Крычаўскае жыццё».

Значныя сродкі з бюджэту накіроўваюцца на ўдасканаленне сістэмы аховы здароўя раёна. Дзякуючы гэтаму з'явіўся новы лячэбна-дыягнастычны корпус, адрамантаваная частка старога лячэбнага корпуса. Праводзіцца пастаянная работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы і аснашчэнні новым, сучасным абсталяваннем аддзяленняў установы аховы здароўя раёна.

Завяршэнне рамонту старога лячэбнага корпуса дазволіць, напрыклад, аднавіць работу радзільна-гінекалагічнага аддзялення. У старым лячэбным корпусе таксама плануецца ўстанавіць камп'ютарны тамограф, што дазволіць палепшыць якасць медыцынскіх паслуг, адпадзе неабходнасць паездак у абласны цэнтр.

Журналісты раённі заклікаюць чытачоў ахвяраваць хоць бы невялікую суму грошай на рамонт старога лячэбнага корпуса, ад чаго выйграюць усе жыхары Крычаўшчыны.

Па звестках на 14 сакавіка гэтага года, на дабрачынным рахунку — 1721 рубель. Значную суму пералічыў калектыў раённага выканаўчага камітэта (775 рублёў). Зрабілі свой унёсак і калектывы СШ № 8, ясляў-сада № 19, упраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне райвыканкама, філіяла ААТ «Магілёўсаюздрук». Не засталіся ўбаку і жыхары горада: двое ахвяравалі па 100 рублёў, адзін — 85... Кожнае ахвяраванне набліжае ўвядзенне ў эксплуатацыю старога лячэбнага корпуса. Збор сродкаў працягваецца.

Сродкі можна пералічыць на дабрачынны рахунак BY34AKBB36420007723877300000, адкрыты ў філіяле 714 ААТ «АСБ Беларусбанк», БІК AKBBBY21714, УНП 700087775.

Адрамантуем бальніцу разам! Гэта будзе годны падарунак усім жыхарам Крычаўшчыны і малой радзіме.

У суботу ў Асіповічах — чэмпіянат краіны

З 22 да 24 сакавіка ў мясцовым ФАК «Юнацтва» пройдуць першынство і адкрыты чэмпіянат краіны ў доўгім цыкле па гіравым марафоне, а таксама адкрыты Кубак Асіповіч па гіравым спорце. Ужо зараз заяўкі на ўдзел падало больш за 120 чалавек з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы, піша раённая газета «Асіповіцкі край».

Рэгістрацыя ўдзельнікаў — 23 сакавіка з 9 да 10 гадзін, урачыстае адкрыццё спаборніцтваў — у 11.00.

У Дрыбінскім раённым Савеце дэпутатаў — новы старшыня

Днямі адбылася чарговая адзінаццатая сесія Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў дваццаць восьмага склікання.

www.dribin.by

У ёй прынялі ўдзел старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Дзмітрый Харытончык, старшыня Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта Дзмітрый Гатоўчык, а таксама дэпутаты раённага Савета дэпутатаў, старшыні сельвыканкамаў, кіраўнікі арганізацый раёна, піша раённая газета «Савецкая вёска».

На сесіі на разгляд дэпутатаў райсавета былі вынесеныя справаздачы Дрыбінскага раённага выканаўчага камітэта аб рабоце па сацыяльна-эканамічным развіцці раёна ў 2018 годзе і аб рабоце прэзідыума раённага Савета дэпутатаў па выніках мінулага года. На дванаццатай пазачарговай сесіі райсавета галоўным на парадку дня было пытанне аб датэрміновым вызваленні старшыні Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў Лідзіі Дубікоўскай ад пасады. Лідзія Савельеўна заявіла аб датэрміновым зняцці з сябе паўнамоцтваў старшыні райсавета.

На пасаду старшыні райсавета Дзмітрый Харытончык прапанаваў кандыдатуру Дзмітрыя Пімашэнкі, дэпутата Катэджнай выбарчай акругі № 9, намесніка старшыні райвыканкама.

Тайным галасаваннем дэпутаты раённага Савета дэпутатаў большасцю галасоў прагаласавалі за прапанаваную кандыдатуру на пасаду старшыні Дрыбінскага раённага Савета дэпутатаў.

Дзмітрый ПІМАШЭНКА.

Аб'яднацца, каб атрымаць поспех

У Мсціславе абмеркавалі развіццё турызму і новы турыстычны маршрут

Як паведамляе газета «Святло Кастрычніка», раён валодае вялікім турыстычным патэнцыялам. Аб гэтым сведчыла рабочая сустрэча па распрацоўцы новага турыстычнага маршруту на Мсціслаўшчыне, якая адбылася ў райвыканкаме. Удзел у яе рабоце прыняў **першы намеснік старшыні райвыканкама Віктар КАСАЛАПАЎ, дырэктар установы «Рэгіянальны цэнтр развіцця» Яўген ЗУЕЎ, уладальнік аграэкасядзібы Валожынскага раёна Анатоль ГАНЕЦ,** прадстаўнікі аграэкатурызму, рамеснікі.

Адкрываючы мерапрыемства, намеснік дырэктара Рэгіянальнага цэнтра развіцця Аляксандр Сямёнаў адзначыў, што вопыт работы па развіцці турызму ў іншых рэгіёнах краіны паказвае, што на Мсціслаўшчыне выкарыстоўваецца далёка не ўвесь існуючы патэнцыял, хоць яна з'яўляецца вельмі прывабнай для аматараў падарожжаў. У развіцці турыстычнай галіны павінны быць зацікаўлены і тыя, хто займаецца рамеснічтвам, занятыя і самазанятыя жыхары.

Цікавым і актуальным было выступленне прадстаўніка Валожыншчыны. Анатоль Ганец, які з'яўляецца ўладальнікам аграсядзібы «Сядзіба Ганка», падзяліўся сваім бачаннем развіцця турызму ў раёне.

— Мсціслаўшчына, нават пры беглым знаёмстве з яе выдатнымі мясцінамі, прыроднымі ландшафтамі, проста здзіўляе, — прызнаўся прадпрымальнік. — У вас захаваліся не толькі выдатныя помнікі архітэктуры, культуры, на якія вы робіце акцэнты, складаючы турыстычныя маршруты. Магу вас запэўніць, што ўвагу прыцягваюць і многія прыватныя дамы, якія маюць архітэктурныя асаблівасці, якія не ўбачыш ні ў адным райцэнтры Беларусі.

— Вясковы турызм як адзін з кірункаў турыстычнай галіны становіцца ўсё больш папулярным, — рэзюмаваў вынік рабочай сустрэчы Віктар Касалапаў. — На Мсціслаўшчыне зарэгістраваны сем аграсядзіб. Выходзячы з вопыту раёнаў, дзе кааперацыя музейных работнікаў, сельскіх сядзіб, рамеснікаў, арганізатараў актыўнага турызму робіць яго больш эфектыўным, нам таксама варта задумацца аб стварэнні падобнага аб'яднання. Гэта, несумненна, павінна станоўча адбіцца на прыцягненні турыстаў, садзейнічаць развіццю самазанятасці насельніцтва і прынесці дадатковы даход усім, хто зацікаўлены ў развіцці турызму ў раёне.

mstlife.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. Нумар падпісаны ў 19.30 21 сакавіка 2019 года.